# НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Цана асобнага нумару 500 м. п.**

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільна, Біскупская вул. 12.** (Biskupia 12).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

**Выходзіць раз у тыдзень.**

Падпіска на адзін месяц з дастаўкаў да хаты 2000 м. п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад ня вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 1000 мк., сярод тэксту 800 мк. і на апошняй страніцы 600 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

**№ 1** **Субота, 3-га сакавіка 1923 г.** **Год I.**



## Голас праўды.

Праўду казаць не заўсёгду ёсьць і было бясьпечна, бо ў жыцьці істнуе пакуль такі благі распарадак, што хто дуж, таго і праўда. Вось і выходзіць што нам беларусам адвеку паднявольным і абязсіленым нельга і не дазваляецца казаць праўду,—дык спрабуем жа мы толькі разважаць аб праўдзе.

На сьвеце ёсьць адна вечна маладая і несьмяротная праўда, якая жывець у душах працоўных творчых людзей. Сваім сьветам яна коліць вочы пануючым — чорным сілам, раскрывае іхнія дрэнныя учынкі і намеры, пагражае іхняму істнаваньню. І вось у сваей абароне гэтыя чорныя сілы, ворагі і праступнікі роду людзкога ўжываюць абы якое аружжа, каб толькі забіць праўду.

Гісторыя праслаўляе шмат вялікіх адзінак, а нават цэлыя народы, якія адважна стаялі ў абароне гэтай праўды і яе сьветач перадавалі патомству яшчэ больш распаленым і сьветазарным, хоць за гэта перанасілі страшэныя мукі, складалі ў ахвяру сваё жыцьцё. Хрыстос быў укрыжаваны за гэтую праўду. Францускі народ у палове XVIII веку за адвагу быць вольным перанес крыж цярпеньня, які пераносіць і цяпер усходняе славянства. Гібее па вастрогах беларускі селянін за тое што дамагаецца вызваленьня свайго соцыяльнага і нацыянальнага „я“, а нашым паслом у Сойме, каб непачуць ад іх праўды, затыкаецца рот (глядзі камунікат у гэтым номеры). Груба скарочаны век беларускім газэтам „Нашай Думцы“, „Беларускім Ведамасьцям“, „Нашай Будучыне“ за тое, што яны апавяшчалі толькі праўду.

З усьмешкай міласэрдзя трэба глядзець на гэты страх перад праўдай, на гэтыя бязсільныя патугі задушыць голас праўды.

Няма той сілы, якая бы здалела спыніць усе ўзрастаючае імкненьне працоўных народаў да сьвету і волі. Той пераможа, хто мае ў што верыць, а мы маем моцную веру і сьвятыя абавязкі. Наш паэт кідае сьветлыя прарочыя словы: „жыў беларус і будзе жыць“ „і будзе ўнукаў панаваньне там, дзе сягоньня плача дзед“. І хто мае вушы, той пачуе гэты голас праўды, які ёсьць словам нашай думкі, радаснымі ведамасьцямі прыгнечаным ацямнелым, голас гэты вядзе нас у нашу будучыну, дзе багуе воля і братэрства, вядзе да шчасьлівага новага жыцьця.

**Ж.**

✦✦✦✦

## З газэт.

### Аб чым гавораць цыфры.

Капіталісты і абшарнікі ў Польшчы нажываюцца ня толькі за шчот работнікаў і спажыўцоў, але і за шчот скарбу. Адным з такіх відаў даходу зьяўляюцца пасрэдныя падаткі. Аб гэтым „Robotnik“ ад 25 лютага піша:

„Спажывец плаціць ураду падатак, забірае яго фабрыкант, і толькі пасьля некалькіх месяцаў варочае іх ураду. У працягу гэтага часу фабрыкант пушчае ў абарот гэтыя грошы, а ўрад траціць на спадку маркі. Дык выходзіць, што пасрэдныя падаткі — гэта дадатковая крыніца даходаў для фабрыкантаў“.

Другім гатункам такіх даходаў зьяўляюцца пазычкі і крэдыты ў Польскай Краёвай Пазычковай Касе. Шмат прыватных прадпрыемстваў заснавалася на ўрадовыя грошы. Так напрыклад: „фабрыка „Pocisk“ заснавалася у 1919 г. дзякуючы урадовай пазычцы ў суме 140 мільёнаў марак, у той час, як акцыянэры зläжылі ўсяго толькі 19 мільёнаў...

Дык вось фактычна Польская дзяржава падаравала фабрыкі некаторым прыватным прадпрыемствам“.

Паказаўшы далей, што толькі за першыя 9 месяцаў прошлага году Польская Краёвая Пазычковая Каса ўдзяліла прамыслоўцам 275 мільёнаў марак крэдытаў па нізкіх (7—8) працэнтах, на тэрмін ад 3 да 6 месяцаў і што, дзякуючы спадку маркі, скарб дзяржавы страціў вялізарныя сумы,—газэта пераходзіць да дзейнасьці сучасных польскіх банкаў.

„Кожны банк мае крэдыт у Р. К. К. Р. і гэтымі грашыма апэрыруе. Калі пазычае каму на вэксаль, дык банк бярэ прынамсі 12 прац. у месяц, ці 144 прац. у год. Гэткі вэксаль зараз-жа з подпісам банку ідзе да Р. К. К. Р., якая яго дыскантуе, лічучы сабе за гэта 7 прац. у год. Банк такім чынам на пазычках ўрадовых грошай зарабляе 137 прац. у год, а Дзяржава траціць мільярды, бо калі атрымае назад свае грошы — яны ўжо варты шмат менш. Гэткім чынам адзін з банкаў у працягу восяні зарабіў на скарбовых грошах 80 мільёнаў. Дык колькі-ж зарабілі ўсе банкі разам, колькі страціў скарб Дзяржавы, колькі трэба было выдрукаваць новых марак і на сколькі дзякуючы гэтаму ўзрасла дарагавізна!“

Дык ня дзіва пасьля гэтага, што польская марка так шпарка прэцца ў ніз. «Kultura Robotnicza» прыводзіць рад цікавых цыфраў:

„Калі прыняць вартасьць польскай маркі адносна даляра на пачатку 1919 г. за адзінку, дык выходзіць, што упала:

| | | | |
|---|---|---|---|
| на пачатку | 1920 г. да | адзнай 12 | часьці вартасьці |
| „ „ | 1921 г. „ | 52 „ | „ |
| „ „ | 1922 г. „ | 185 „ | „ |
| „ „ | 1923 г. „ | 1800 „ | „ |

Іначай кажучы ў пачатку 1920 г. марка была варта каля $8\frac{1}{2}$ фэнігаў

| | | |
|---|---|---|
| у пачатку 1921 г. . . | 2 | „ |
| „ „ 1921 г. . . | $1/3$ | „ |
| „ „ 1923 г. . . | $1/18$ | „ |
| а праз месяц пазьней . | $1/25$ | „ |

Дзякуючы спадку маркі за яе што раз усё меней можна купіць, расьце дарагавізна, а найбалей даражэюць кошты утрыманьня; вось-жа калі прыняць кошты утрыманьня ў студзені 1921 г за 100, дык на падставе аблічэньняў камісіі па барацьбе з дарагавізнай пры Галоўным Статыстычным Урадзе ў сярэднім кошты утрыманьня выглядаюць вось як:

| | | |
|---|---|---|
| у верасьні | 1921 г. . . . | 282 |
| у сакавіку | 1922 г. . . . | 372 |
| у чэрвені | „ . . . . | 487 |
| у ліпні | „ . . . . | 561 |
| у жніўні | „ . . . . | 646 |
| у верасьні | „ . . . . | 766 |
| у кастрычніку | „ . . . . | 913 |
| у лістападзе | „ . . . . | 1216 |
| у сьнежні | „ . . . . | 1642 |
| у студні | 1923 г. . . . | 2507 |

А цяпер бязумоўна шмат яшчэ болей.

Аб тым, на што галоўным чынам трацяцца ў Польшчы народныя грошы, якія ў той ці іншай форме прыходзіцца плаціць, пераважна, шырокім працоўным масам, піша „Walka Robotnicza“. З справаздачы Польскай Краёвай Пазычковай Касы за першае паўгода 1922 г. відаць, што ў той час, калі, бадай, усе выдаткі былі абрэзаны, — выдаткі на войска павялічыліся.

«На публічную асьвету прадбачана ў бюджэце 10,9 прац усіх выдаткаў, выдана—7,5 прац.; на публічныя работы—5,5 прац., выдана 3,8 прац; на абарону працы і сыцыяльную апеку—1,8 прац., выдана 1,3 прац. Зато вайсковыя выдаткі, прадбачаныя ў суме 33,7 прац. бюджэту, падняліся да 35 прац., дасягаючы вялізарнай сумы 91,5 мільярдаў на агульную суму 261,8».

Цяпер ў мірным часе мілітарызм, пахлаяе больш як $1/3$ усяго бюджэту, і толькі паменьшыўшы ваенныя выдаткі можна пазбавіцца недабору ў бюджэце, але у нас наадварот—цяжар вайсковых выдаткаў ня толькі не зьменьшываецца ды яшчэ павялічываецца.

„Выключна ваеннае назначэньне мае таксама пазычка 400 мільёнаў франкаў, якую прызнаў Польскай Дзяржаве саюзны францускі ўрад. Працэнты ад гэтай пазычкі у залатых франках будзе плаціць працоўная люднасьць“.

✦✦✦✦

## Палітычныя падзеі.

**Францыя.** Сацыялістычныя паслы дамагаюцца звальненьня камуністычнага пасла Кашэна на той падставе, што хаця ён і выступаў проціў акупацыі Рура, але яго прамова ня была антыдзяржаўнаю.

Рада міністраў унесла ў Палату дэпутатаў праэкт аб удзеленьні крэдыту ў разьмеры 100 мільёнаў франкаў на выдаткі па акупацыі Рурскага басэйну.

**Англія.** У Палаце гмін лібэралы ў сваіх прамовах востра крытыкавалі палітыку Францыі адносна Нямеччыны, даказываючы, што акупацыя Рура павялічыла недастаткі бедных клясаў і дрэнна адбілася на разьвіцьці прамысловасьці на кантынэнце Эўропы, і што гэтая палітыка мае на мэці, ня атрыманьне нямецкіх даўгоў, а якісь-ці іншыя замеры.

Палата гмін большасьцю галасоў кансэрватараў проціў лібэралаў і работнікаў адкінула папраўку, якая дамагалася утварэньня камісіі пры удзеле Злучаных Штатаў у справе урэгуляваньня нямецкіх даўгоў, так сама адкінута прапазыцыя аб удаленьні ангельскіх войск з Месапатаміі.

**Чэхія.** Урад Чэхаславацкі запрапанаваў Савецкай Украіне пазычку на суму 15 мільёнаў чэскіх карон на адбудову сельскай гаспадаркі на абшарах, залюдненых чэскімі каляністамі.

**Амэрыка.** Газэты паведамляюць, што прэзыдэнт Злучаных Штатаў Гардынг мае замер пачаць перагаворы з Англіяй у справе акупацыі Рурскага басэйну. Істнуе праэкт утварэньня фінансавай кантрольнай камісіі, пастановам якой Нямеччына павінна падпарадкавацца. Камісія гэтая вызначыла-б разьмер выплаты нямецкіх даўгоў. Францыя ў такім выпадку павінна зараз-жа пакінуць акупаваную тэрыторыю.

**Польшча.** У Варшаве чуць не штодня адбываюцца дэманстрацыі безработных. 23 лютага паліцыя хацела разагнаць дэманстрантаў, ранена чатырох работнікаў.

23 лютага адбыўся у Варшаве зьезд вайсковых асаднікаў; з прывітаньнямі між іншымі выступалі паслы Вітос (P. S. L.). Панятоўскі (Wyswolenie). Зьезд закончыўся прывітаньнямі на чэсьць ганаровага сябры саюзу асаднікаў Маршалка Пілсудскага.

**Літва.** Літоўскі Урад выслаў да Лігі Народоў тэлеграму, ў якой працівіцца падзелу нэйтральнай паласы паміж Польшчай і Літвою і дамагаецца устанаўленьня таго праўнага становішча, якое утварылася на падставе Сувальскага трактату.

У нэйтральнай паласе дробныя бойкі трываюць далей.

### Чычэрын аб міжнародным становішчы.

Чычэрын, у размове з журналістамі, дае агульны агляд міжнароднага становішча. Франка-нямецкі канфлікт ня можа выклікаць, па яго думцы новай сусьветнай вайны ў блізкай будучыне. Прымірэньне паміж Францыяй і Нямеччынай шмат аблягчылася-б пры пасрэдніцтве Англіі разам з Амэрыкай. Але Англія ня ўмешываецца ў гэтую справу, маючы на мэці свае карысьці. Рурскае пытаньне і Лазана папсавалі стасункі паміж Англіяй і Францыяй і цяпер між гэтымі дзяржавамі павінен распачацца пэрыад моцнага дыплёматычнага змаганьня.

Дыплёматычныя удачы Турцыі ў Лазане Чычэрын тлумачыць падтрыманьнем Савецкай Расеі, якая на яго словах заўсёды выступае ў абароне прыгнечаных народаў. У пытаньні аб правілах Чычэрын сказаў, што ня толькі Расея і Турцыя, але і шырокія колы францускага і італьянскага грамадзянства лічаць нявыгадным адчыненьне праліваў чужым ваенным караблям, іначай кажучы, Англіі.

### Справа Віленшчны.

Польскі Урад выслаў да Рады Паслоў ноту, у якой дамагаецца прызнаньня галоўнымі дзяржавамі ўсходніх межаў Польшчы, а таксама і граніц з Літвою.

Чычэрын выслаў да Польскага Ураду ноту, у якой адзначыў, што, згодна Рыскім трактатам, усялякія спорныя пытаньні паміж Польшчай і Літвой павінны вырашацца на падставе паразуменьня паміж гэтымі дзяржавамі. Вырашэньне-ж гэтых пытаньняў т. з. Лігай Народаў, няпрызнаннай Савецкімі рэспублікамі, ёсьць у супярэчнасьці з Рыскім трактатам і пагражае міру.

Расейскі Урад спадзеецца, што Польшча і Літва вырашаць спор палюбоўна і прапануе сваё пасрэдніцтва, каб уладзіць істнуючыя непаразуменьні.

„Kurjer Polski“ падае, што Маскоўская „Правда“, друкуючы дэпэшу аб заняцьці літоўцамі Клайпэды, далучае да гэтага карту, на якой ёсьць спэцыяльна выдзелены абшар, ахопліваючы Вільню, Горадню і Сувалкі з загалоўкам „Польская акупацыя“.

„Times“, абгаварываючы выпадкі ў нэйтральнай зоне, піша, што пара ўжо скончыць з гэтымі пытаньнямі. Калі Вільня павінна належаць да Польшчы, дык трэба прызнаць яе Польшчы, а калі прызнаюцца літоўскія дамаганьні, дык трэба іх вырашыць у спрыяючым сэнсе для Літвы.

## Пералом у Эўропе.

Трудна сёньня адказаць, ці сучасная сусьветная напружанасьць давядзе да новай ваеннай катастрофы ці да якогасьці, хаця-б пераходнага новага ўкладу сілаў і новай раўнавагі дзяржаў. З мамэнтам уваходу францускіх войск у Вэстфалію бадай усе эўрапэйскія біржы выказалі страшэнную трывогу, пры гэтым запанавала атмасфэра перадваеннай панікі. Праўда потым было чуваць розныя успакаеньні, але выходзілі яны выключна ад францускага ўраду, які зразумела, быў бы найбалей рад спажываць спакойна здабычу. Вось-жа трэба сьцьвердзіць, што хоць немцы і ня здольны да вайны, апрача таго ў Эўропе няма дзяржавы, якая не баялася-б вайны. якая-б не рызыкавала ў

такім выпадку сваім істнаваньнем,—гэта паніка мела пад сабой моцныя падставы, бо найшырэйшыя масы людзасьці трафным інстынктам адчулі, што сучасн е становішча ніякім чынам ня можа быць утрымана і што мірнага выхаду з стварыўшайся сытуацыі быць ня можа.

Аружная акцыя над Рэйнам паралізуе наймацнейшы ў Нямеччыне і Эўропе асяродак прамысловасьці, і ня толькі павялічывае цяжар ваенных выдаткаў у Францыі але апрача таго ў сто разоў павялічывае недастатак і ня долю народных мас у Нямеччыне, падвышаючы дарагавізну і беэработьце. Ужо цяпер рабочыя масы акупаваных абшараў знаходзяцца ў становішчы рэвалюцыйнага бражэньня, не ў абароне прыгнечаных нямецкіх фабрыкантаў, але ў абароне сваіх жыцьцёвых інтарэсаў, сваіх правоў, свае людзкай вартасьці, свае арганізацыі. Ясна, што гэты рэвалюцыйны рух мусіць распаўсюдзіцца і узмагчыся на ўсім абшары нямецкай дзяржавы. Калі гэты канфлікт ня разрашыцца вайной ці ўмяшацельствам, то бадай ня падлягае сумлеваньню, што ў Нямеччыне распачнецца новы пэрыяд рэвалюцыйных змаганьняў. Ясна, што францускія мілітарысты прымалі гэта пад увагу, і гэтыя магчымасьці рэвалюцыі ёсьць другім страхам, які мае вярнуць ім утрачаную дапамогу італьянскай рэакцыі і ангельскага імпэрыялізму. Вось дзеля гэтага сёньня ня можна сказаць, што пераважыць у абозе імпэрыялістычных дзяржаў: унутраныя споркі і антаганізмы, што вырасьлі на грунце сусьветнай тузаніны за панаваньне ці пачуцьцё супольнай вонкавай небясьпекі з боку паграажаючай работніцкай рэвалюцыі. У кожным выпадку лёсы гэтай барацьбы наперад прадвырашаны.

# Весткі з Сойму.

## КАМУНІКАТ

## Беларускага Пасольскага Клюбу.

12-га лютага 1923 году ў Сойме Польскай Рэчыпаспалітай адбылася дыскусыя над экспазэ Міністра Заграгічных Спраў.

Прамоўцы з розных польскіх клюбаў, абгаварываючы экспазэ Міністра, паміж іншым, падробна разглядалі пытаньне аб усходніх граніцах Рэчыпаспалітай, устаноўленых Рыскім трактам 18 сакавіка 1921 г. Усе яны непакоіліся тым, што ўсходняя граніца Польшчы не зацьверджана праз Эўропу і даказывалі, што заданьнем польскай заграгічняй палітыкі павінна быць найхутчэйшае устанаўленьне праўных граніц усходніх праз міжнароднае іх прызнаньне.

Шмат у гэтай справе мелі што сказаць, ня менш зацікаўленыя, беларускія пасльі, прадстаўнікі Народу Беларускага, які падзеляны праз Рыскі трактат. Аднак жа прадстаўнік Беларускага клюбу ня мог у гэтай справе выказаць свае пагляды, бо ў нябывала грубы спосаб большасьцяй галасоў правіцы і P. S. L. была прынята прапазыцыя аб спыненьні дыскусыі, маючай па мэце не даць голасу перш на перш беларускім і украінскім прадстаўнікам.

Бяручы пад увагу вышэйсказанае, гэтым рашуча пратэстуем супроць пазбаўленьня права свабоды слова з соймавай трыбуны ў найважнейшых для нас справах і апавяшчаем ніжэйпададзенае:

1. Рыскі Трактат 18 сакавіка 1921 г. быў зроблены без учасьця і санкцыі ўсяго Беларускага Народу.

2. Справа Віленшчыны, дзе палякі, побач беларусаў, літвіноў і жыдоў, зьяўляюцца меншасьцяй, была разьвязана аднабока праз палякаў, бо ані беларусы, ані літвіны і жыды учасьця ў выбарах у Віленскі Сойм 8 студня 1922 г. ня прымалі.

3. Усходняя граніца Польшчы абапёртая на Рыскім твактаце, ёсьць тымчасовая і можа быць аканчальна ўстаноўлена згодна з міжнаронным правам і ў паразуменьні з цэлым Беларускім народам.

**Беларускі Пасольскі Клюб.**

Варшава 13. II 1923.

### Які парадак працы ў Сойме.

Розныя справы пасльі аканчальна вырашаюць на паседжаньнях, сабраўшыся ўсе разам. Але, каб што вырашыць, ці што пастанавіць, дык трэба раней гэта ўсё абдумаць. А каб кожны пасол аб усім ведаў, дык гэта немагчыма. Адзін чалавек ня можа быць і праўнікам, і фінансістам, і еканамістам, і інжынэрам і гэтак далей. Дзеля гэтага, апрача пленарных (поўных) паседжаньняў усіх паслоў, у Сойме ёсьць розныя камісіі, як асьветная, зямельная, адбудовы і іншыя, ў якія ўваходзяць сумысьля падабраныя людзі. У кожнай камісіі засядае больш-менш чалавек 30. Вотжа розныя справы звычайна разглядаюцца ў камісіях, пасьля камісіі дакладаюць усяму Сойму, а Сойм увесь або даклад гэны прымае, або адкідае.

Мы тут вылічым усе соймавыя камісіі, пакажам хто з беларусаў у якой камісіі працуе і што там робіцца наагул і што для нас беларусаў.

### I. Камісія зямельная.

У гэтай камісіі ад беларусаў працуе пасол Базыль Рагуля, родам з Навагрудзкага пав. Крыху памагаюць яму і іншыя пасльі беларусы. Зямельная камісія апрача зямлі, рупіцца і аб лясох. Нашы пасльі ўнесьлі ў камісію дамаганьне, каб спыніць калянізацыю, землі забраныя для чужынцаў аддаць тутэйшым, а таксама, каб спыніць рубку лясоў. Ведама, што на ўсё гэта польскія пасльі ня годзяцца і нашых падтрымаць ня хочуць, але часам крыху слухаюць і нашых. А каб і не паслухалі, дык усёроўна пасльі беларусы ніколі ня згодзяцца з калянізацыяй чужых людзей на беларускіх землях.

Аб тым, што дагэтуль зроблена з нашымі землямі, міністр земляробства ў камісіі паказаў гэтак:

**Лік ваенных калянiстаў да канца 1922 г.**

| | | атрымалі | прыгатаваны надзелы |
|---|---|---|---|
| Навагрудзкі вокруг | | 3430 | 2438 |
| Палескі | „ | 1477 | 991 |
| Валынскі | „ | 3548 | 3104 |
| | | 8455 | 6533 |

Калі мы зложым разам тых калянiстаў, што ўжо атрымалі зямлю і тых, якія усьцяж атрымліваюць, прыяжджаючы на прыгатаваныя для іх надзелы, дык атрымаем у азначаных вокругах больш-менш 14988 ваенных асаднікаў, блізу выключна чужынцаў.

**Лік распарцэляванай (нарэзанай) зямлі да канца 1922 г.**

| | | |
|---|---|---|
| Навагрудзкі вокруг | 80.849 | гэктараў. |
| З гэтага ліку: | | |
| На асаднікаў | 50.813 | „ |
| На зямельную рэформу | 17.429 | „ |
| На іншыя мэты | 4.253 | „ |
| Астаецца на 1923 год | 8.354 | „ |
| Палескі вокруг | 127.185 | гэктар. |
| З гэтага ліку: | | |
| На асаднікаў | 26 907 | „ |
| На зямельную рэформу | 33 805 | „ |
| На іншыя мэты | 38 542 | „ |
| Астаецца на 1923 год | 27 931 | „ |
| Валынскі вокруг | 94.223 | гэктар. |
| З гэтага ліку: | | |
| На асаднікаў | 55.551 | „ |
| На зямельную рэформу | 26.563 | „ |
| На іншыя мэты | 10.859 | „ |
| Астаецца на 1923 год | 1.150 | „ |

Усяго ў трох вокругах распарцэлявана ўжо 302.257 гэктараў зямлі.

| | | |
|---|---|---|
| З гэтага ліку: | | |
| На асаднікаў | 133.271 | гэктар. |
| На зямельную рэформу | 77.897 | „ |
| На іншыя меты | 53.654 | „ |
| Астаецца на 1923 год | 37.445 | „ |

З вышэйсказанага відзім, што ў трох названых вокругах, дзе найлепшая зямля, найбольш зямлі папала асаднікам. Апрача таго і гэна зямля, што назначана пад рэформу зямельную і на іншыя мэты, мы мала пэўны, што трапіць у рукі тутэйшага прапоўнага селяніна.

Трэба тут яшчэ адзначыць, што лік калянiстаў на беларускіх землях, куды большы, бо апрача беларускага Навагрудзкага вокругу, асаднікам даюць нашы землі ў Дзісенскім, Дунілавіцкім і іншых пав. Віленскай губ., а такжа і блізу па ўсей Горадзеншчыне.

Апрача зямлі калянiсты атрымліваюць дапамогу грашмі і інвэнтарам. Як мы ведаем, дык ім выдана ўжо 7201 конь.

Знача, Польскі ўрад прадусім дагэтуль рупіўся, каб на нашых і ўкраінскіх (Валыньскі вокруг і часьць Палескага) землях асадзіць калянiстаў, прысланых з Польшчы, а аб нашым сялянстве ён мала думаў.

### II. Камісія адбудовы.

Ад беларусаў пасол А. Аўсянік. У камісіі гэтай даведаліся, што розныя „бюра адбудовы« працуюць дужа дрэнна, што даюцца грошы і дрэва паном з выразнай шкодай для сялян. Дзеля гэтага левыя дамагаліся, каб арганізаваць іх нанова. Покуль што ўсё асталося пастарому, але больш звернецца ўвагі, каб ня было надужыцьцяў.

### III. Камісія прамыслу і Гандлю.

Ад беларусаў пасол Ф. Ярэміч. Гэта камісія забараніла сеч і вывозіць

---

### У сьвяточны дзень.

Так прыгожы старажытныя званіцы,
Блізкі сэрцу — крыжы на разстаях
У тыя белыя бяз сонейка раніцы,
Калі ціха дзень засмучаны упаўзае...
А у сэрца—радасьць плыве не акана.
Шыбкі вецер, сам адзін, цалуе
Божы раны
І апаску бедраў, што як сьцяг дзіцячы,
Трэпліцца па гіпсавай хвігуры.
На гары—са срэбра вылітыя хмуры
У вочах—сьлёзы (каб хто ня убачыў!)
Устужкі бораў крэсьляць ледзь
відныя крэсы.
Зсохлі ў пылу папяровыя кветачкі
У хрыстовым з белых рож вяночку...
А па што ты смуціся, сьвяты дзянёчку,
Прытуліўшыся да сініх плахтаў лесу?

Ганна Галубянка.

## Гутаркі аб беларускай літэратуры.

Беларуская літэратура! Ні так даўно, бо якіх 17 гадоў таму назад мало была людзей, якія бы дапушчалі магчымасьць істнаваньня гэткае літэратуры. Апрача жменькі філолагаў і славістаў аб беларусах мала было вядома сьвету, а нават самі беларусы мелі слабае прадстаўленьне аб моцных асновах, на каторых апіраецца іх літэратура. Істнаваньне старае літэратуры хоць і дапушчалася, аднак што яна вельмі даўняя, вялікая й багатая, што яе мог-бы пазайздраваць у беларусаў не адзін і дзяржаўны народ,—аб гэтым нікому і ў галаву не прыходзіла.

Што-ж мы па праўдзі называемо літэратурай? Хоць, як ні як. дакладныя акрэсьленьня (дэфініцыі) і трудная рэч, бо залежаць ад індывідуальнага паняцьця, аднак сяк так выясьніць гэта можна. Літэратурай або пісьменнасьцьцю народа называецца сумма ўсіх твораў чалавечае думкі, захаваных ці умацованых у слове вустна ці пісьменна.

Пісьменнікі, якія хадзілі ў школы, чыталі уселякія кніжкі, займаліся уласнай прасьветай—твораць літэратуру або пісьменнасьць; здольныя з талентам адзінкі з народа, хоць нават і пісаць ня ўмеюць, твораць славеснасьць. Кожны народ мае перш на перш славеснасьць, а толькі пасьля разьвівае літэратуру. Пісьменнікі не павінны забываць аб славеснасьці свайго народу, бо у ёй знойдуць яны жыва захаваную, быццам зачараваную, мінуўшчыну, жывы водблеск народнага сьветагляду, сілу пачуцьця і праўдзівае хараство суцэльнага народу.

Узяць песьні калядныя, купальныя, жніўныя або хоць і вясельныя, што лунаюць і цяпер ад Дзьвіны да Прыпяці ад Нёмана да Дняпра—гэта ж народныя творы, каторыя стварыў калісьці, перад тысячамі гадоў народ, а каторыя не замоўклі і да гэтае пары. Усё што перажыў і перацярпеў наш народ песьня захавала, гэтая харошая, доўгапамяцьлівая народная, простая песьня.

Так сама многа даўняга, старажытнага зачаравана ў беларускіх казках, лягендах, загадках, прыказках, шэптах і закляцьцях. Усюды гаманіць, сьмяецца або сумуе, цешыцца або плача многацярпялівая народная душа.

Багатая і прыгожая наша літэратура, а так мала яшчэ знаёма яна беларусам!

Пачатак беларускае літэратуры губіцца ў дагістарычных часах. Многа з гэтых скарбаў зьніштожыў усё паедаючы неміласэрны час, шмат старых даўных твораў уступіла мейсца перад новымі, а тое што асталося якую-ж вялікую падарож зрабіла ад часаў Рогвалода ці Усеслава з Полацка ажно да нашых сумных часаў! Шмат запаху й красы страцілі гэтыя кветкі, а якімі-ж прыгожымі мусілі быць яны даўней, калі яшчэ і цяпер чаруюць нас сваім дзіўным хараством!

У дзесятым сталецьці пачало шырыцца ў нас хрысьціянства. З хрысьціянствам прыйшла і літэратура. Многа з таго што пісалі візанційскія грэкі ды пасьля баўгары, прыйшло да нас у пісаных кніжках, у чужой старабаўгарскай мове і кірылічнымі літэрамі.

Увайшло гэта да беларусаў пад апекай князёў і духавенства. Пачалася тайная барацьба паміж славеснасьцю і літэратурай. Першая славіла даўны свой уласны сьветагляд, другая нясла чужыя новыя заветы. Славеснасьць паганская пеяла аб сіле, харастве й славе, літэратура хрысьціянска галасіла песьню міласэрдзя й пакорнасьці.

Два не падобныя да сябе сьветагляды. Духоўныя асобы выступалі процiў песьняў, сьпевак, называючы іх грэшнымі ды богупраціўнымі справамі, за што і пагражалі нябесными карамі. Песьня уцекала ў лес і хавалася пад стрэхі. З княжых ды баярска-панскіх двароў яе прагналі хутка. Запанавала новая вера, новы хрысьціянскі сьветагляд.

Аднака творы народнага духа, народная паэзія, якая ні дарма называецца несьмяротнай, пратрывалі да нашых часаў.

Вось такія былі больш менш пачаткі беларускае літэратуры.

---

Ляжыць перад намі кніжка Максіма Гарэцкага: Хрыстаматыя Беларускае Літэратуры. Разглядзецца крытычна ў зьместе й распарадку рэчы ў гэтай кнізе і будзе нашай мэтай.

Няпрыемнае уражэньне робіць тое, што аўтар наагул адкінуў саўсім народную славеснасьць. Ці аўтар не прызнае яё значэньня й зьвязку традыцыйнага са штучнаю літэратурай, ці проста уважае яе за малацэнную—судзіць аб гэтым не бярэмся. Адзначыць мусім толькі тое, што народная славеснасьць даўно ужо заваявала сабе правы літэратурныя і заўсёды ад разбора, клясыфікацыі яе і пачынаецца кожная літэратура ці то украінская, ці расейская, ці польская.

Аўтар, каторы не раз казаў, што сам асабіста добра ведае расейскую літэратуру, павінен бы зьвярнуць увагу ў гэтым выпадку хоцьбы на расейскія хрэстаматыі й літэратуры.

Пішучы ці гісторыю літэратуры ці гістарычную хрэстаматыю абсолютна немагчыма беларусу не заглянуць у расейскія ці украінскія працы, бо адтуль трэба выцягнуць тое беларускае багацьце, каторае гэтыя народы залічылі да сваей культуры.

Украінцы ў стасунку да расейцаў ужо адабралі свае багацьце. Астаецца тое самае зрабіць і нам беларусам.

Хрыстаматыя пачынаецца з памятак беларускае старае кніжнае мовы ад 10 да 12 сталецьця: Тураўскае Евангельле, Сьвятаславаў Ізборнік, Летапісь Нэстора, Даніла Паломнік, Напіс Лазара Багуша на крыжы Ехфрасініі Полацкай, Творы Кірыла Тураўскага, Слова аб палку Ігаравым. З гэтым можна згадзіцца, хоць німа тутака нічога з твораў Клімэнта Смолятыча ды Аўраама Смаленскага. Але трэба катэгорычна адзначыць, што прыведзеныя тут па 10—12 сталецьцямі творы апокрыфічныя як: Аб Адаме і Еве, Як хадзіла Багародзіца па муках, Пчала, Хронограф абсолютна да гэтага часу не адносяцца, бо... яны шмат пазьнейшыя! Гэта ёсьць творы якія перакладаліся, перапісываліся з літэратур баўгарскай ды грэчаскай. Спіскі гэткіх рукапісаў знаходзяцца ў расейскіх бібліатэках і надрукованы ў аддзельных каталогах, дзе дадзены большыя ці меншыя выняткі і адначасна азначана сталецьце, ў каторым памятнік напісаны. Аддзельныя студыі, вучоных славянскіх і расейскіх падробна разьбіраюць такія памяткі як: Пчала, Хронографы, Апокрыфы, Фізыялёг, Златоструй, і т. п. З

асіну, бо яе мала, а яна дужа патрэбна на запалкі.

### IV. Камісія асьветы.

Ад беларусаў пасол Б. Тарашкевіч, заступнік пасол С. Міхайлоўскі. Справа беларускай школы будзе разглядацца ў першых днях сакавіка (марца) месяца сёл. г. Есць надзея, што пры нейкіх варунках, можна будзе закладаць свае родныя школы.

### V. Камісія заграніччых спраў.

Ад беларусаў пасол Кс. А. Станкевіч. На паседжаньнях гетай камісіі аж да апошніх дзён усё разгедалася справа Клайпэды, якую занялі Літоўцы.

### VI. Камісія ахроны працы.

Ад беларусаў пасол П. Мятла. Даведываемся, што з Расеі за 1922 год вярнулася 424.000 беларусаў і што на беларускіх землях няма сусім інспэктароў ахроны працы.

### VII. Камісія адміністрацыйная.

Ад беларусаў пасол Каліноўскі. Камісія гэта разглядае надужыцьця ваяводаў, старастаў, чыноўнікаў і агулам адміністрацыі. Рупіцца таксама і аб самаўпраўленьнях, аб якіх будзе гутарка у камісіі ў Сойме па Вялікадні. Што да стояк, дык выявілася, што яны залежаць ад мясцовых самаўрадаў (гмін, соймікаў) і што датуль парадку са стойкамі ня будзе, пакуль не ўпарадкуюцца, як належыцца рады гмінныя і павятовыя (соймікі).

### VIII. Камісія вайсковая.

Ад беларусаў пасол М. Кахановіч. Разглядалася, хто мае разстрэліваць, сьмерцяй пакараных. Пастанавілі, што войска. Таксама гаварылі аб будове фабрыкі пораху.

### IX. Камісія камунікацыі.

Ад беларусаў пасол Якавюк. Усіх працуе на чугунцы 180.000 чалавек.

### X. Камісія грамадзкай апекі.

Ад беларусаў пасол С. Баран і заступнік Кс. А. Станкевіч. Нашы паслы стараюцца, каб урад лепш як дагэтуль апякаваўся беларускімі сіротамі.

### XI. Камісія публічнага здароўя.

Ад беларусаў пасол Рак-Міхайлоўскі.

### XII. Камісія пэтэцыйная.

Ад беларусаў пасол С. Баран.

### XIII. Камісія публічных работ.

Ад беларусаў пасол А. Аўсянік.

### Плян працы у Сойме.

Да Вялікадня: Справы Скарбу. Па Вялікадні: Справы самаўрадаў, а пасьля розныя уставы, як дапаўненьні Канстытуцыі. („Крыніца“).

---

С. Кл.

## Лясное пытаньне ў Беларусі.

У №№ недаўна закрытай „Нашай Будучыны“ ўжо паведамлялась аб грандыёзных лясных парубках, якія цяпер робяцца на беларускай тэрыторыі. Ужо адно тое, што на чале гэтых парубак стаіць гэтак вядомы генерал-пагромшчык Булак-Балаховіч выстаўляе гэтыя „лясныя опэрацыі“ ў самым злавешчым асьсвятленьні. Там, дзе выступаюць паны, падобныя да Булак-Балаховіча з іх мілаю, але мала-прыемнаю кампаніяй, ведама, што пахне вялізнай спэкуляцыяй і нажываю, вялізным грабежствам народных інтарэсаў. Праз гэта нічога дзіўнага, што Беларускі Пасольскі Клюб унёс сьпешны запрос у Сойм аб гэтых парубках і з другога боку выпусьціў анкету дзеля выясьненьня разьмераў гэтых парубак.

Разумеецца, калі будзе сабраны ўвесь анкетны матар'ял, можна будзе бачыць больш-менш верны абраз, што там параблюць п. Булак-Балаховіч са ўсею сваею кампаньяй. Аднак-жа й цяпер можна выказаць тое-сёе аб даным пытаньні.

Лес, як гэта зусім ясна, іграе вялізарную ролю ў нашым жыцьці. Ен патрэбен дзеля будаўляных і прамысловых мэтаў, дзеля апалу і г. д. Лес служыць дзеля вырабу розных прыладаў, ён дастаўляе вугаль, дзёгаць, смалу, нарэшце, драўляную масу дзеля вырабу паперы і інш. Аб ужыўным значэньні лесу можна судзіць ужо па адным тым, што да вайны ў Расеі на адну душу насяленьня ўжывалася ў год каля ⅓ кубіч. сажня, што складае крыху больш, як 100 куб. фунтаў.

Адсюль ясна, якое вялізнае значэньне дзеля гаспадарчага жыцьця мае дабываньне і абработка лясных матар'ялаў, а таксама дастаўка іх у гэткія месцы і раёны, дзе лесу мала.

Некалі ў Зах. Эўропе і бліжэйшых да Беларусі часьцях Маскоўшчыны было вельмі шмат лесу, а насяленьне пры гэтым было вельмі рэдкае. Кожны сёк сабе лес, дзе хацеў, як дзеля сваіх гаспадарчых патрэбаў, так і дзеля ачысткі зямлі пад ральлю і ў рэзультаце гэткае расчысткі лесу выігравала толькі сельска-гаспадарчая культура краю. Аб ашчаднасьці ў абхадзэньні з лесам тады не магло быць і мовы і толькі паступова з ростам гарадзкога жыцьця цэннасьць ляснога матар'ялу пачынае расьці, а разам з гэтым мяняецца й пагляд на лес. З безгаспадарнага дару прыроды, даступнага кожнаму, лес робіцца цэннаю рэчаю ўласнасьці і нарэшце найбольшы лік гэтае ўласнасьці трапляя ў рукі абшарнікаў фэодалаў усіх рангаў, разумеецца тым самым шляхам, якім да іх наагул трапілі сялянскія землі, прасьцей кашучы праз захват і грабеж.

Разам з тым працэс зьнішчэньня лясоў ішоў далей і нарэшце грознае становішча лясоў змусіла дзяржаўную уладу ўвесьці, ў інтарэсах агулу, пэўныя абмежаваньні ў правы гаспадарчае эксплёатацыі лясоў. Бо, як давяла навука, лясы маюць і вялікае фізыка-гэографічнае значэньне, галоўным чынам, цераз свой уплыў на клімат. Лясы зьмяншаюць летнюю жару і зімовы холад, робяць маруднейшым растапленьне сьнегу і праз гэта болей пастунова сьцякае вясною вада, што з аднаго боку зьмяншае руйнуючую работу вясьняных паводак, з другога боку падтрымлівае ровень рэчнае вады на большай вышыкі і г. д.

Дзеля гэтага лёгка зразумець, якое вялізнае значэньне павінны мець лясы і дзеля сельскай гаспадаркі. Яно ня чуецца з першага пагляду і ня кідаецца ў вочы за кароткі кавалак часу. Дзеля таго, каб уплыў лясоў на кліматычныя і прыродныя варункі можна было пачуць і зразумець, патрэбен доўгі кавалак часу. Але гэтым яшчэ больш падкрэсьліваецца патрэба найашчэднейшага абхаджэньня з гэтым вялізным прыродным багацьцем. Вельмі лёгка ў кароткі срок нанесьці лясом гэткі ўдар, які можа іх зьвесьці на нішто, альбо пасьля якога яны ледзь змогуць ачухацца праз дзесяткі гадоў.

У шмат якіх краёх былі прыняты меры, каб павялічыць лясны абшар і аднавіць лясы цераз штучнае разьвядзеньне і насаджваньне іх. Але ж ведама, што вялікіх рэзультатаў спробы гэтыя даць не маглі, і краі, высекшыя свае лясы, змушаны цяпер увозіць да сябе значны лік лясных матар'ялаў з гэткіх краёў, у якіх лясы захаваліся яшчэ у больш менш значным разьмеры.

Гэткімі краямі, што вывозяць лес і лясныя матар'ялы, зьяўляюцца напр., Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі, Расея, Швэцыя і інш.

Вываз лесу з быўшае Расеі ішоў, галоўным чынам з паўночна-заходняга раёну, г. значыць якраз з беларускіх губэрняў.

(*Канец будзе*).

---

## Пісьмы з Сэрбіі.

### Дзед Васо.

— Дык пойдзем?

— Чаму-ж... пойдзем!

Зора, маладая дзяўчына, дачка майго гаспадара, надта зграбная і жвавая, стаяла ля ганку з кійком ў адной руцэ, і з яжой ў клумку ў другой і ўжо гатовая ісьці ў горы.

— Дык хутчэй!..

— Зараз... дайце сабрацца...

— Які вы маруда, цэлае раньне зьбіраецца і ўсё ніяк не зьбярэцца.

Зора сьмяялася і сьмех яе ня рэзаў вуха, а быў мяккі, прыемны... Я любіў гэты сьмех, хоць з Зорай у мяне былі чыста прыяцельскія адносіны. Мяне цікавіла жыцьцё сэрбскага селяніна, цікавіла ўсё чыста, куды занясла мяне нядоля, цікавілі горы і Зора, як тутэйшы чалавек, была мой павадыр. Заўважыў яшчэ, што Зора мела добры голас і слухаючы яе песьні, поўныя жалю і цяжкай журбы, я згадываў сваё жыцьцё, свой цяпер невясёлы дзень, згадываў пра Бацькаўшчыну, плылі успаміны...

— Дык пашлі?

— Але...

Сягоньня мы сабраліся ісьці на другі бок ракі Маравы. Надоечы мне адна кабета казала, што за вёскай Сехуры—гэтак з мілю, мо дзьве—ёсьць падзямельле. Галоў з дванаццаць таму назад ў гэтым падзямельлі зьвіў сабе логавішча Жыка Пекіч, злодзей і душагуб, і сваімі наскокамі навадзіў жах на ўсю ваколіцу. Хоць Жыка Пекіч і ў цяперашні час не навіна ў Сэрбіі, але я парашыў туды схадзіць.

Давялося нам ісьці вёскай Папоўці. Досі вялікая стаіць яна прытуліўшыся да грудзей гары Чывут. Чывут па сэрбску жыд, народны сказ перадае, што ў пару князя Мілана ў нагах гэтай гары павесілі заможнага жыда з Беча (Вены), які ехаў гандляваць ў Грэцыю.

Пачалі падыходзіць да канцавой хаткі.

Ідзём далей... Сустрэўся нам сустарэлы дзядок...

— А-а добар дан, дзед Васо (Васіль)? Како е? (як здароўе, як жывеш).

— Дзякую за згадку. Добра... рыпаюсь пакуль што. А гэта хто?—кінуў дзед ў мой бок.

---

прац, такіх ясна і цьвёрда можна аднясьці данныя творы да таго ці іншага сталецьця, а нават да беларускае ці расейскае або украінскае літэратуры.

Разгледаючы ў хрэстаматыі памяткі 13 — 15 сталецьцяў можам сказаць, што шмат чаго тутака няма, што павінна-бы знайсьці мейсца ў гэткай хрэстаматыі. Заўважым толькі што названьне „Увараўская кроніка“ (15 ст.) ня мае падставы, бо не граф Увароў яе пісаў, а толькі яе купіў у сваю калекцыю, дык павінен быць тутака загаловак такі: Хроніка XV ст. з Увараўскае калекцыі.

Тое самае трэба сказаць аб хроніках з бібліятэк Быхоўца і графаў Рачыньскіх. „Залатая пара“ беларускае літэратуры, як называе аўтар з 16 стал. прадстаўлена ў хрэстаматыі меньш багата чымсьці за сталецьця 10 — 15. А была гэтая пара надта прадуктоўнай як у працах рукапісных, так і ў друкаваных, бо ў гэты час нацыянальны ўціск амаль і ня існаваў. Ішло змаганьне за культуру і за навінкі з рэлігіознага боку. Былі спробы ачышчэньня кніжнае мовы ад чужога стара славянскага намула і ўвядзеньня жывое простае народнае мовы. Памагаў гэтаму на Беларусі рэлігійны рух Рэфармацыі. Спробы ў гэтым кірунку Скорыны, Сымона Буднага, Цяпінскага,, Стефана й Лаўрэнта Зізаніяў, Валентына Негалеўскага надта цікавы, а на жал мала выясьнены.

У хрэстаматыі пана Гарэцкага выняткі з твораў Скарыны, Цяпінскаго так сяк магчымыя, недастатачны аднак у творах Буднага, Зізаніоў. Аб Валентыне Негалеўскім няма нічога ў хрэстаматыі, так як і ў літэратуры...

Таксама ні слова аб кніжцы Хрыстофора Бронскага—Апокрізіз—кніжцы друкаванай у Вільні ў 1597 г., кніжцы якой слава й значэньне пашырыліся па ўсёй амал славяншчыне...

Зусім непатрэбна даны адрывак з тэстамэнту украінца Васілія Загоровскага, які нічым з беларусамі не звязаны; тэстамэнт напісаны ў мове блізка што беларускай, але трэба памятаць, што амаль усе памяткі мовы XIV—XVI сталецьцёў на Украіне абеларусчаны, бо літоўскія князі, заваяваўшы Украіну, пісалі граматы, прывілеі і законы набеларуску і гэтая мова, мела тады перавагу на цэлай Украіне.

Абмылкова залічаны Памва Бэрында да XVI сталецьця а Стэфан Зізані і і полемічны твор проціў Люторoў да XVII сталецьць (глядзі станіцы 50 і 59), павінна быць як раз наадварот.

Ня можна згодзіцца, каб уважна праглядзела кніжку Выдавецкая Камісыя Бел. Навуковага Таварыства!

«Сход» беларускае літэратуры ў XVII сталецьці, іначай кажучы палітычны і культурны занепад прадстаўлены ў хрэстаматыі вельмі слаба; аб гэткіх пісьменьніках як Іпат Поцей, Лявон Карповіч, Мэлет Смотрыцкі трэба было даць больш матарыялу. Нічога не дано з твораў Сільвэстра Коссова, што быў родам з Віцебшчыны, Іноцэнта Гізеля, што радзіўся ў Слуцку і аб другіх іншых, аб каторых, праўда, нічога і ў гісторыі літэратуры пана Гарэцкага няма. Можна бы аб гэтым і не пісаць, каліб у хрэстоматыі не было адрыўкаў такіх твораў, аб якіх не ўспамінаецца ў гісторыі літэратуры пана Гарэцкага...

На вякікі жаль няма ніякіх, апрача аднэй, інтэрмэдый са школьных драм. А трэба падкрэсьліць, што з упадкам старае літэратуры (разумець гэта трэба: літэратуры якая зрадзілася на на грунце мовы царковна-славянскай) з яе штучнай робленай мовай, пачынае з'яўляцца ў XVI сталецьці на сцэну жыцьця простая чыста народная гутарка ў інтэрмэдыях школьных драм. І цікава тут тое, што інтэрмэдыі мелі мэтай асьмеяньне простае мовы, цёмнага селяніна, аго нават рэлігіі, кіраваліся да зністажэньня гэтае „некультурнасьці“ а прычапіліся наадварот, хоць і сьмехам, да моцнае падставы беларускага адраджэньня, апёртаго на моцным фундамэнце права істнаваньня корня народнасьці — жывой яго мовы.

Гэты важны мамэнт не адзначаны так як бы трэба ні ў хрэстаматыі, ні ў гісторыі літэратуры пана Гарэцкага.

Але дзіву трэба дацца, што духоўныя вершы, як: Аб страшным судзе, О мой Божа веру Табе і Стары Восіп барадаты памешчаны як творы 17 сталецьця! Ужо сама мова іх сьведчыць, што ніколі яны з'явіцца ў 17 сталецьці не маглі! Верш: Аб страшным судзе паводлуг мовы найдалей можна аднясьці да 18 сталецьця, верш жа: О мой Божа веру Табе і верш: Стары Восіп барадаты творы беларусаў-езуітаў Полацкай каллегіі з канца XVIII сталецьця.

З беларусаў, якія з прычыны ўціску на Беларусі і немагчымасьці жыцьця для сябе ўцекалі ў 17 сталецьці хто на Украіну, хто ў Маскоўшчыну, апрача Сымона Сітнякевіча Полацкага, не дано ніякіх твораў. А доля гэтым беларусам не дала магчымасьці працаваць для сваіх, дык працавалі яны на Украіне для ўкраінцаў, а ў Маскоўшчыне... уставаўлялі яны расейскую літэратурную мову, правадзілі рэформы, паднімалі культуру!

Гэтак беларускія вучоныя і пісьменьнікі баранілі нашу і сваю чэсьць, хоць роднай справы абараніць не маглі.

Вельмі бедна ў хрэстаматыі адзначана 18 сталецьце. З друкаў амаль нічога няма, інтэрмедыі з гэтаго сталецьця за тое ажно тры.

Аб друках у Амстэрдаме беларуса Гальяша Копіеўскаго-Копіевіча, кальвіна па рэлігіі, перакладчыка, друкара і тварца шрыфта „гражданкі“ для Пятра Вялікага — няма нічога.

А шкада! Ня былобы тады абмылковых назваьняў „гражданкі“ кірыліцай, што з лёгкай рукі пана Язэпа Лёсіка, ня гледзячы на частыя пратэсты, паўтараецца з дзіўным упорствам праз усю беларускую прэссу. Мушу заўважыць што, ў бытцам бы расейскай мове Копіеўскаго шмат чыста беларускіх слоў, якія не ўжываюцца ў расейцаў.

Да 18 сталецьця аднесены ў хрэстаматыі „макаранічныя“ вершы: Як цецерук у лесе балбоча і За пенкнай паненкай аж душа сумуе. Гэта неправільна: першы верш Віцебскага польска-беларускаго вершапісца Аношкі, каторы пісаў у пачатку XIX сталецьця, а другі невядомаго аўтара з Дзісеншчыны, па пазьнейшы за 1820 год.

Ня ведаю як сказаць але „макаранічны“ як назова, не згаджаецца з маім паглядам. Я бы макаранічнымі называў такія вершы, дзе ёсьць лацінскіх словы і звароты. З такіх макаранічных вершаў, маю запісану адну калядку, праўдападобна езуіцкае творчасьці:

С калядою omnes ad vos ідзём к вам,
Есьці gratis вельмі міла будзе нам.
Gloria laus Богу ўсе заспяваем,
Гаспадарам largum vesper ўраз прызнаем.
Пачынайця-ж усе fratres каляду,
Почым я вас усіх на premium завяду.
Мольце Бога donet nobis Fortunam
Cum salutum мы Вам жычы chano unum:
І хай Deus благасловіць пры споры
Даму, людзям, гумне, клеці, аборы.
А во Новы Год mittat tibi gaudia
Et prosperet усё памысльна omnia.
Днесі молім salvatorem Mariae,
Дабрадзей наш longum vitam хай жыве,
Пасьля сьмерці super Coelos хай бытуе,
Copiosum і mercendem там пачуе.

Твор гэты з 18-го сталецьця, Такіх макаранічных вершаў было больш, складалі іх і вучні, асабліва езуіцкіх каллегіяў.

**Ромуальд Земкевіч.**

(Працяг будзе).

— Гэта мой комшыя (сусед)... Беларус.

— Як? наставіў вуха дзед.

— Бе-ла-рус...

— А—а... зразумеў... такое імя або прозвішча?

— Не, Васо... ня імя, а нацыя, цэлы народ... Беларусь...

Дзед пакруціў галавою.

— Ня чуў нешта такога краю. Ведаю, ёсьць ці была Русія (Расея), а Беларусь... не, не знайду ў памяці!

І дзед Васо з цікавасьцю сэрбскага селяніна разглядаў усяго мяне.

— Гэта грахі мінуўшчыны,—адказаў я дзеду.—Вы ня чулі пра маю Бацькаўшчыну, бо ніхто вам не казаў, а ня казаў, бо на тое ня было разрашэньня. Навет ня ўсе расейцы ведалі пра мой куточак... Але цяпер другі час, трэба спадзевацца, што вы яшчэ шмат пачуеце пра маю старонку...

Дзед зацікавіўся, пытаўся аб чым мог і ведаў, а нарэшце запрасіў ў хату на чарку ракія (гарэлкі)

Зашлі... Хата чысьценькая, прыбраная... Выпілі па чарцы, перакінуліся прыемнай гутаркай, пасьля зноў выпілі. Закуска ў Сэрбіі ня ў модзе і гарэлку пьюць як ваду.

Дзед Васо бязустаньня распытываў, якой мы веры, ў якім мейсьцы нашы мяжы, як жывуць нашы сяляне, як будуюць сваю долю, ці скрозь пісьменныя...

Я ня меў патрэбы таіць ад сэрба, як цяпер цяжка жывецца на маей Бацькаўшчыне

— Нудна, калі так... — Дзед Васа паківаў галавою і вочы яго зацягнула журба.—Тая-ж песьня што і ў нас была з туркамі. Але сьмяецца апошні... Трэба толькі ня губляць веры ды ня згаджацца ні на якія умовіны.

Тут дзед пусьціўся ў філязофію; ад яго ж я даведаўся, што ён мае 6 сыноў, дванаццаць ўпукаў і ўнучак і яшчэ дасюль верхаводзіць імі.

— Яно так і павінна быць, — заўважыў мне дзед:—пакуль я жывы — я гаспадар, а паложуць на кут—дзяліцеся маім дабром.

У Сэрбіі так і вядзецца, бацька да апошняга дня верхавод ў хаце, слова бацькі—закон і наруга над ім лічыцца як цяжкая віна; ўсе чыста працуюць ў адну хату, хоць і кватэруюць паасобку. Здараецца, хоць і рэдка што і пасьля сьмерці бацькі сямейка не разсыпаецца.

У дзеда Васо мы неяк засядзеліся, а калі выходзілі, дык ўжо сонца пачало хавацца за горы, а з гор сунуліся таемныя змрокі, траха прабегаў па дрэве яшчэ ня шкодны вецер.

— Вось табе і паглядзелі падзямельле!..

Зора глядзела на мяне і усьміхалася.

— Што-ж... за тое яшчэ адзін пачуў пра маю Бацькаўшчыну!

Падзямельле глядзець парашылі ісьці заўтра ўраньне.

Дзед Васо правёў нас да брамы, сунуў сваю руку ў маю і з прыхільнасьцю сказаў:

— Хочаш мець долю—цярпі, а хочаш мець волю—змагайся!...

М. Запольскі.

✦✦✦✦

# ДОПІСЫ.

### Лебедзеўская гм. (Вялейшчына).

У вёсцы Груздова ў прошлым годзе была беларуская школа. Сяляне пажадалі мець сваю школу і сёлета, дзеля чаго быў састаўлены прыгавар і падпісаны жыхарамі вёскі Груздова. Гэты прыгавар войт гміны не захацеў зацьвердзіць, бо яму непадапалася, што сяляне дамагаюцца беларускай школы. Войт зьдзекуецца з грамады, бо ведае, што яго кар'ера ў руках усемагучых kresowych kacyków.

Беларус.

### Юрацішская гм. (Валож. п.).

Няма жыцьця ад асаднікаў. Дзе-б ні сабралася тутэйшая моладзь па вечарыну, ці вясельле, як зараз-ж зьяўляюцца асаднікі і начынаюць буяніць, а калі хто асьмеліцца сказаць слова проціў, дык зараз-жа абаб'юць. Але вось трапіла нарэшце каса на камень. 4-га лютага ў нашай вёсцы было вясельле. Гуляла моладзь прыстойна і весяла. Раптам зьявілася 8 асаднікаў з двара Бокшышкі і загадалі, каб усе пакінулі памешканьне і засталіся толькі дзяўчаты, бо яны—асаднікі хочуць танцаваць. Тутэйшы дзяцюк С. Шлёмпа ня зьвярнуў на гэта ўвагі, тады адзін асаднік ударыў яго бутэлькай па галаве. Шлёмпа ня даў сябе ў крыўду,— так захадзіўся каля іх, што усе асаднікі разбегліся хто праз дзьверы, а хто і праз вакно.

13-га лютага асаднікі з таго-ж двара Бакшышкі напалі на гаспадара в. Сяменкі, калі ён выезджаў з мястэчка да хаты, і пабілі яго да крыві.

Каваль з в. Іванкі, Васюкевіч варочаўся з м. Трабы крыху падвыпіўшы і спаткаўся з паліцыянтамі, якія арыштавалі яго і моцна пабілі. Вынікам гэтага было тое, што Васюкевіча палажылі ў бальніцу, дзе яму зрабілі апэрацыю, ў часе якой ён і памёр.

У м. Юрацішкі на праваслаўныя Каляды моладзь зладзіла вечарыну. Гэта чамусь-ці не спадабалася паліцыі. Паліцыянт схваціў за каўнер аднаго хлопца, а той спрытна скінуўшы сярмягу і пакідаючы яе ў руках паліцыянта, пашоў да дому. Арыштаваную сярмягу аднясьлі на „posterunek“, а назаўтра арыштавалі 5-цёх хлапцоў і адправілі перш у Валожын, а потым у вастрог у Вялейку. Цяпер іх зволнілі пад надзор паліцыі, і абвінавачываюць у непаслушэнстве ўладам.

А вось у в. Чарнелі, дзе солтыс зьбірае сходы, на якіх зьбіраюць для паліцыі „даніну“ (бульбы, яйца), ўсё ціха і гладка.

К. Сьвет.

✦✦✦✦

# З беларускага жыцьця.

✦ 27 лютага ў касьце сьв. Мікалая кс. Бобіч адслужыў жалобнае набажэнства па Ядвігіну Ш. на першыя ўгодкі яго сьмерці.

✦ Вышаў з багатым зьместам № 2 „Krynicy“ беларускай тыднёвай сялянскай газэты, Друкуецца лацінікай.

✦ Вышла з друку аддзельнай кніжкай і прадаецца ў кнігарні першая прамова пасла Б. Тарашкевіча.

✦ Ад беларускіх настаўнікаў, што былі ў Кракаве на курсах, Міністэрства прасьветы патрэбавала дакумэнтаў кваліфікацыі, довадаў польскага падданства і інш. Тыя якія ня маюць польскага „obywatelstwa“, ня будуць назначацца на пасады вучыцялёў.

✦ Забойцы с п. В. Станкевіча злоўлены. Падзяка за гэта належыцца тайнай паліцыі.

✦ 25 лютага г. г у залі Беларускай гімназіі п. А. Луцкевіч прачытаў для праваслаўных сэмінарыстаў лекцыю аб Адраджэньні Беларусі. Сэмінарысты былі дужа ўдзячны. Беларуская сьведамасьць сярод іх надта пашыраецца. Былоб не ад рэчы, каб нешта падобнае рабілася і для каталіцкіх клерыкаў.

✦ У Празе Чэскай вышаў месячнік „Беларускі Студэнт“ № 1, гэткага зьместу: Ад рэдакцыі. Да ідэолёгіі беларускай моладзі. Брачыслаў Скарыніч: Дзьве праўды. Брачыслаў Скарыніч: Рупмася аб сабе. Марка Вочнік: Усеславянскі студэнцкі кангрэс у Празе 16—22 сьнежня 1922 г. Гумарыстычны куток. Я. Ст.: Важная справа. Я. Станкевіч: Нацыянальны назоў Беларусаў. Грыневіч: Паміж двух агнёў. Вацюк Сланоўскі: Аблава на медзьведзя. З жыцьця Белар. Прав. Царквы. Хроніка.

✦ Вышла новая расейская газэта ў Вільні «Виленская Рѣчь» пад рэдакцыяй Егорава, якая удзеляе нямала мейсца беларускаму жыцьцю.

✦ На Вялікдзень склікаецца зьезд беларускіх вучыцялёў пачатковых школ. Зьезд мае адбыцца ў Вільні.

✦ Цэнтральная Школьная Рада зрабіла захады перад уладай аб адкрыцьці пры Віленскім унівэрсытэце катэдры па беларусазнаўству.

✦ „Віленскае Выдавецтва“ Б. Клецкіна купіла ў белар. пісьменьніка Краўцовага Макара рукапіс перакладу апавяданьня А. Купрына „Алеся“. Кніжка ў хуткім часе мае друкавацца.

✦ У вёсцы Сегда, Навагрудзкага павету была зладжана беларуская вечарына. Гулялі „Птушку шчасьця“ Ф. Аляхновіча і „Пасланец“ Л. Родзевіча. Хоць пісар тутэўшай гміны пазрываў усе абвесткі аднак шмат зьехалася з акалічных месц народу і з вялікай зацікаўленасьцяй праглядзілі пьесы.

✦ Урад Беларускага Музыкальна-Драматычнага Гуртка абвінавачываецца прокурорскім надзорам у тым, што урад у пісьме афіцыяльным да Гарадзкога Старасты памясьціў словы такога зьместу: „Беларускае грамадзянства прасьледуецца ў сваім краі на кожным шагу рознымі прычэпкамі. Мала таго што выкідаюць з урадовых пасад, але цяпер дайшло і да таго, што культурна-прасьвятныя ўстановы правакатарскім спосабам стараюцца закрыць“.

✦ **Ад Беларускага Т-ва помачы пацярпеўшым ад Вайны.** Таварыства прыносіць падзяку ахвяраваўшым на Беларускі дзіцачы прытулак ў Вільні ў студні месяцы г. г.

Ксяндзу Семашкевічу за 10 п. збожжа, 5 п. буракоў і 5 п. бульбы. Сялянам вёскі Капач, Палачанскае воласьці і Арсеню Сярэбраньнікаву за 1 п. 11 ф. жытняе мукі і 1100 м. гр. Данілу Дудку сабраўшаму 2 пуды жытняе мукі, 1 ручнік і 2 арш. кужалю. п. Дубяйкоўскай 10.000 м. і 5 фунтаў кілбасы на сьвяты. п. М. Шутовічанцы 4.000 м. Ігнату Канчэўскаму 10.000 м. Ксяндзу Зыгмунту Стафінскаму 11.150 м. Студэнту Прануку Пяткевічу 10.000 м. Антону Бабрэўцы 3.000 м. (па падп. аркушу № 5 (1922 г.) і гр. Антону Сецьку, сабраўшаму 30.400 марак.

У прытулку 100 дзяцей, беларускіх сірот, на утрыманьне гэтае лічбы патрэбны вялікія грошы.

Грамадзяне! дапамажыце хто чым можа гадаваць і вучыць бедных сірот. Ахвяры прыймае кіраўніца Беларускім прытулкам Г. Кавэрда (Wilno, Ostrobramska № 9)

Віцэ Старшыня Т-ва А. Сакалова.

### Выстаўка Беларускага друку.

25 гэтага сакавіка, якраз у дзень абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі ў Коўні быўшым Старшынёю Першага Беларускага Ураду (Народнага Сэкрэтарыяту) Язэпам Варонкаю арганізоўваецца выстаўка беларускага друку.

А тут, на Бацькаўшчыне, зазвычай вялікая гадаўшчына сьвяткуецца на агульнай вячэры пустасловіем і лятункамі.

Ці ня лепей было-б п думаць і ў нас аб выстаўцы, якая выйш а-б можа ня менш цікаваю, як на чужыне.

### Няўжо праўда?

Белгрус з пад Дзевянішак жаліцца што не атрымлівае беларускіх газэт,—ён дазнаўся што кіраўнік Дзевяніскай пошты канфіскуе беларуск. газэты па загаду Валожынскага старосты. Гэткія загады маюць і гмінныя рады.

### Беларускія Студэнты у Празе.

✦ Т-ва Адраджэньня Беларускага Студэнства скора будзе арганізавана. На зборцы ініцыятараў (звыш 15 чал.) была выбрана з трох сяброў, Янкі Ермачэнкі, Янкі Гэніуша і Уладыслава Грыневіча, камісія, якой даручана весьці ўсю арганізацыйную працу.

Таварыства будзе працаваць паміж беларускім студэнствам і грамадзянствам, кіруючыся хрыстовымі ідэаламі. Пры арганізацыі вельмі шмат памагае брат Украінец, сябра Паньчак, старшыня Саюзу Адраджэньня Украінскага Студэнства.

✦ Рэфэратаў у Беларускім Студэнскім Саюзе ў Празе было прачытана сёлета да каляд некалькі. Сябра Тамаш Грыб прачытаў рэфэрат на тэму „Беларускае Адраджэньне“. Сябра Я. Станкевіч прачытаў, 1) Аб Беларусох лацініках, 2) Нацыянальны назоў Беларусаў, 3) Зрабіў рэцэнзію „Маскоўска Беларускага слоўніка“ братоў М. і Г. Гарэцкіх. Сябра Грыневіч прачытаў апавяданьне „Між двух агнёў“.

(«Б. С.»)

✦✦✦✦

### Пісьмо ў рэдакцыю.

*Паважаны грамадзянін Рэдактар!*

У г з. „Dziennik Wileński“ № 31 была надрукована злосная выдумка на Беларускае Грамадзянскае Сабраньне. З прычыны таго, што памянёная газэта адмовілася надрукаваць нашае пісьмо, просім не адмовіць зьмясьціць у Вашай паважанай газэце ніжэйпададзенае.

1. Сэкрэтарыят Бел. Пасольскага Клюбу зьмешчаецца не на Біскупскай 12, а на Віленскай 12—6.

2. Усе сходы, якія адбываюцца у памешканьні Грамадзянскага Сабраньня адбываюцца легальна.

3. Ігра у лато адбывалася з дазволу улад і ніякіх інцыдэнтаў ня было. Бывалі памылкі з боку тэхнічнага персаналю пры прадажы карт (лото), але пасьля праверкі з боку публікі і старшынь Сабраньня усе высьветлялася і канчалася агульным задаваленьнем.

Сэкрэтар У. Більдзюкевіч.

✦✦✦✦

# БЕЛАРУСКІ ПАКАЗАЛЬНІК.

*Віленская Беларуская Гімназія* (8 клясаў) — Вострабрамская вул., 9.
*Беларускае Навуковае Т-ва*—Вільня Віленская 8.
*Віленскі Беларускі Музыкальна - Драматычны Гурток* — Біскупская № 12-6.
*Беларуская Урадовая гімназія* Daugavpils Yarsava iela 16.
*Рыскі аддзел* Беларускага *Культурна-Прасьветнага т-ва „Бацькаўшчына“* — Łatwija, Riga, Nikołaj ul'a 20 dz. 1.
Беларускае *Культурна Прасьветнае т-ва „Бацькаўшчына“ у Латгаліі* — Łatwija, Riga, Witebskaja, 16.
*Люцынскі Аддзел* Беларускага *Культурна Прасьветнага т-ва „Бацькаўшчына“ у Латгаліі* — Łatwija, Lucyn Sjebeżskaj 66.
*Рада* Беларускай *Калёніі у Латвіі.* — Łatwija, Riga, Bulw. Totlębena, 7-3.
*Навагрудзкая* Беларуская *Гімназія* Навагрудак.
*Нясьвіжская* Беларуская *Гімназія*. Нясьвіж.
*Беларускае Выдавецкае т-ва* Вільня, Віленская 8.
*Таварыства* Беларускае *Школы і Цэнтральная* Беларуская *Школьная Рада* Вільня, Віленская 12
Беларуская *Кнігарня* — Вільня, Завальная вул. 7.
„Беларускі *Звон*“ Вільня, Вострабрамская вул 9-23.
Беларускае Прэс-Бюро *у Рэвалі* — Europa. Estonija. Rewal. Post-Kast 153, Biełaruskaje Press-buro.
Белар. *Аддзел пры Мініст.* Прасьветы *у Латвіі* — Łatwija, Riga, Nikolaja eela 36 a.
Weis ruthenisches Presburo — Dancig, 1, „sentm 11“.
Беларускі *Студэнскі Саюз* — Віленская вул. 12-6.
Беларускі *пасольскі клюб.* Warszawa, Sejm Rzeczypospolitej.
*Сэкрэтарыяты* Беларускага *Пасольскага Клюбу*
1) Вільня, Віленская вул. № 12. кв. 6.
2) Горадня, Мастовая 9.
3) Ваўкавыск, Пясковая 14. У гэтых сэкрэтарыятах паслы прыймаюць кожную нядзелю ад 10 да 1 г.
4) м. Крынкі Горадзенскага павету. Гродненская вул., № 34
5) м. Саколка. Гродненская вул., № 34.
6) м. Клешчэлі Бельск. павету. вул. Коперніка, № 4.
7) Бельск. Замкавая вуліца д. № 3, намяшканьне 1. Сэкрэтаром Канстанцін Карыцкі.
8) м. Глыбокае Дзісьненскага павету, вул Сенкевіча № 46.
9) Жодзішкі, Сьвенцянскага п. кс. Годлеўскі.
10) Баранавічы.
11) Столбцы.
12) Несьвеж.
Беларускі *Цэнтральны Камітэт помачы пацярп. ад вайны.* Вільня, Віленская, 12, 6.
*Віленскі* Беларускі *Камітэт помачы пацярп. ад вайны.* Вільня, Вострабрамская 9-24.
*Горадзенскі* Бел *Кам помачы пац. ад вайны.* Горадня, Мастовая, 9.
Беларуская *Драматычная Майстроўня* Вільня, Вострабрамская, 9.
Беларускі *прытулак.* Вільня, Вострабрамская, 9.
Беларускі *Жаночы Гурток.* Вільня, Вострабрамская, 9.
*Эміграцыйнае бюро у* Гданску. Gdańsk III, Damm II. Weis-ruthenische Informationsbüro.
«*Маладое Жыцьцё*» Вільня, Вострабрамская, 9.
„*Наш Шлях*“ Вільня, Віленская, 12.
„Беларускі *Сьцяг*“ Літва Kaunas, Senatoriqu 9 - 8.
Беларускі *Музэй.* Вільня, Вострабрамская, 9.
*Віленскі Саюз* Каапэратываў Вільня, Малая Погулянка 12.
*Сэкцыя* Беларусаў *пры Украінскай Студэнцкай Грамадзе.* Warszawa Długa 29 Hotel „Polski“ m. 11.

Зварочуемся да ўсіх беларускіх арганізацый на сьвеце з просьбаю — прысылаць у гэты аддзел свае адрасы.



Рэдактар-Выдавец Я. Лагіновіч.

Друкарня С. Бэккера, Субач, 2.